ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
16 02 2017 г.

SEX=БАЛЯСЫ

Асноўны інстынкт

«Я зразумела цябе і не буду раздуваць з мухі слана, робячы згубныя для нашых адносін высновы. Подпіс: ні адна жанчына ў свеце». Аднак вітаю вас, шаноўнае спадарства. Як вы ўжо, мабыць, здагадаліся, сёння гаворка пойдзе пра тое, чаго хоча (ці думае, што хоча, або хоча думаць) жанчына і як яна таго дабіваецца. Вось толькі не трэба ўсміхацца. Я не настолькі наіўны, каб не разумець, што спасцігнуць гэтую таямніцу не можа ні адзін мужчына ў свеце. («Існуе міф, што калі жанчыну не крыўдзіць, дык яна і не пакрыўдзіцца».) Але ж ёсць сярод нас такія няўрымслівыя і бясстрашныя людзі, як даследчыкі (мне падаецца цалкам лагічным, што прадстаўніц прыгожага полу найперш вывучаюць нашчадкі Адама, інакш які сэнс станавіцца навукоўцам у гэтай сферы?). Вось хто сапраўды наіўны, дык гэта яны: думаюць, што змогуць знайсці нейкі код. («Дзяўчына становіцца сапраўднай жанчынай, калі ўпершыню кажа свайму сужэнцу: «Гэта добры пакет, не выкідвай».)

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Пра бясстрашнасць я невыпадкова згадаў. («—Ты хоць бы раз пярэчыў жонцы? — Канешне! Хочаш, шрам пакажу?») Вось, напрыклад, вучоныя з ЗША падлічылі, колькі разоў за жыццё ў жанчын... змяняецца памер адзення. Не, для прадстаўніц прыгожай паловы чалавецтва памяняць некалькі разоў за раніцу строі — абсалютна нармальная з'ява. («Божухна! Як жа складана быць жанчынай... Вырашыла абуць іншыя туфлі — давялося нават сподняе пераапранаць!») Але намякаць на памер... («Сёння была на рынку. Даведалася, што ў нас ёсць усяго тры памеры адзення: «на вас», «не на вас» і «трэба прымяраць».) Карацей кажучы, навукоўцы падлічылі, што ў сярэднім цягам жыцця жанчыны мяняюць яго 31 раз. Сярод прычын, якія ўплываюць на гэтыя змяненні, былі названы замужжа, цяжарнасць, страта родных. Не абышлося і без уплыву свят, падчас якіх добраахвотнікі з даследавання елі шмат смачнай і часта шкоднай ежы. («— Скажы мне мае любімыя словы! — Смачна есці!») Многім знаёма, праўда? («Пайшла на кухню заварыць гарбаткі, даела міску аліўе».) Ціха-ціха, гэта не я, а навукоўцы кажуць! («Тыя, хто гавораць, што ноччу нельга есці, няхай паспрабуюць растлумачыць, для чаго прыдумалі святло ў халадзільніку».) Мы ж з вамі дакладна ведаем, што гэта не так. Ну, ці амаль не так... («Я моцная, я адказная, я валявая, я ўпэўненая, я дзёрзкая, я яшчэ пяць хвілін паляжу і ўстану...») Дарэчы, даследчыкі высветлілі, што мужчыны мяняюць памер адзення прыкладна 24 разы за жыццё. Мы набіраем вагу часцей за ўсё тады, калі ўзнікаюць праблемы на рабоце.

Новы «асноўны інстынкт»: у любой незразумелай сітуацыі — скідай адзенне.

Апроч іншага многія добраахвотнікі з таго даследавання прызналіся, што ў іх у шафах вісіць адзенне не па памеры, але яны спадзяюцца калі-небудзь пахудзець для яго. («Перад чарговым сезонам перамерала ўсё з шафы. Налезлі толькі пацеркі».) Зрэшты, як мы ведаем, шмат адзення ў нашых чараўніц можа быць зусім не з прычыны неадпаведных памераў, так? («Маю дзяўчыну завуць Анжэла, але яна адгукаецца толькі на «Куплю».) Гэта яшчэ адзін з мілых жаночых асноўных інстынктаў — шопінг. Ведаючы пра яго, іншым разам і мы ім можам скарыстацца з карысцю для сябе. («— Купіў жонцы новае футра. Яна ўжо другі тыдзень маўчыць. — Што, не спадабалася? — Такой была ўмова!»)

А наконт адзення, што чакае свайго часу, дык тое можа быць праўдай. Гэта нядаўна даказала 52-гадовая расійская спявачка Алена Апіна з колішняй папулярнай групы «Камбінацыя». Яна, як той казаў, успомніла маладосць. («Прыйшла раней часу з начной змены дадому і ўбачыла напаўголеную дзяўчыну, што выйшла з ваннага пакоя. Пракруціла ў галаве ўсяго тры думкі: сын пасталеў, муж аф...ў ці дзед паверыў у сябе?») Апіна знялася ў эратычным кліпе на песню «Блізкасць», прадэманстраваўшы не толькі выдатную фігуру, але і позы, і адзенне, што выклікалі спрэчку сярод карыстальнікаў сеціва наконт адпаведнасці паводзін спявачкі яе ўзросту. Як нехта трапна заўважаў: гэта ўжо не «Камбінацыя» — гэта бюстгальтары, стрынгі, панчошкі... Кажуць, на такі эпатаж спявачку справакавала расставанне з мужам, з якім Апіна паспела адсвяткаваць сярэбранае вяселле. Ведаеце, гэта такі новы своеасаблівы трэнд часу, вынайдзены жанчынамі, такі новы «асноўны інстынкт»: у любой незразумелай сітуацыі — скідай адзенне. («Маці вучыць маладую дачку: «Калі што будзе не так з мужам, адразу пачынай або плакаць, або распранацца».)

Гэты трэнд зноў жа нядаўна пацвердзіла яшчэ адна расійская спявачка Глюкоза. («П'яная шахматыстка прыпаўзла дадому на карачках, сцвярджаючы, што каралева як хоча, так і ходзіць».) Яна рэгулярна выкладвала ў сеціве свае фотаздымкі з адпачынку, дзе найчасцей пазіравала ў купальніку і часам — павярнуўшыся да камеры задам. Многім падпісчыкам гэты акцэнт на стройных нагах і пругкай «пятай кропцы» не спадабаўся, пра што яны з абурэннем і паведамілі ў каментарыях. Што зрабіла ў адказ Глюкоза, здагадаліся? Яна пачала выкладваць яшчэ больш фотак сябе любімай і асобна той часткі цела, якая адразу пасля спіны губляе сваю ганарлівую назву. Атрымалася па прынцыпе «ўсіх не вітаю»...

Прыхільнікі спявачкі, магчыма, не мелі рацыі. Але і Глюкоза магла б стрымацца. Бо ёсць такі анекдот: «Спускаешся ты такі па лесвіцы, а яна — сацыяльная». І пра гэта варта памятаць.

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«Для нас рэп — як трыбуна»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Падаецца, што альбомам «Аднакарэнныя» Belaroots паспрабавалі запоўніць прабел, які ўтварыўся ў нашай рэп-музыцы. Вы ставілі перад сабой менавіта гэтую мэту?

Zeman: — У беларускамоўнага рэпа ніколі не было свайго фірмовага стылю. Магчыма, гэта абумоўлена стэрэатыпам: рэп — найперш музыка пратэсту. Першае, што з'явілася ў нашым супольным праекце, — назва. Мы апелюем і да каранёў хіп-хопа, і да нашых нацыянальных, сімвалічна ўяўляем карані дрэва. І вось на базе назвы, як дрэва, «вырас» альбом. Ды і насамрэч ніякай незапоўненай нішы ў нашым рэпе не было, бо тут месца шмат.

Angst: — Найперш мы думалі пра тое, каб выказацца. Але разам з гэтым мы з Kontra'м сваім удзелам у праекце яшчэ і закрылі нейкія свае юнацкія гештальты.

— Навошта было аб'ядноўвацца ў адзін гурт, калі кожны мог напісаць па ўласным альбоме?

Zeman: — Па-першае, разам цікавей. Па-другое, з'яўляецца больш ідэй. Па-трэцяе, разнастайнасць. У Belaroots, апроч каранёў, прысутнічаюць чатыры стыхіі, розныя кропкі карты, і кожны з удзельнікаў прэзентуе сваю частку. Але разам мы ўтвараем суцэльны праект.

Angst: — Разам працаваць лягчэй: не трэба пісаць тры куплеты для песні, часцей за ўсё дастаткова аднаго *(смяецца)*. Ці запоўнілі мы нішу адным альбомам, пакажа час, але спыняцца мы не збіраемся.

— Слухаючы альбом, я заўважыла, што ў тэкстах песень многа адсылак і да класікі беларускай літаратуры, і да песень, якія можна назваць знакавымі ў нашай музыцы. Вы наўмысна гэтыя цытаты, алюзіі ўпляталі ў тэксты?

Zeman: — Калі працуем над тэкстам, не стараемся зрабіць адсылку да іншых твораў. Яны неяк самі па сабе з'яўляюцца. Я нават не адразу ўспомню, пра якія цытаты ідзе гаворка. Сапраўды, так мы выказваем пэўную павагу музыкам, але гэта не штучна зроблена, усё атрымалася натуральна. Калі пішаш рэп, шукаеш натхненне дзе заўгодна. Слухаеш, глядзіш, шмат чытаеш, каб нешта «стрэльнула».

Angst: — Час ад часу проста хочацца згадаць творчасць тых, каго любіш.

— Кожны з вас мае свае творчыя праекты, амбіцыі, сваю публіку. Што шукалі ў супольнай працы?

Angst: — Для мяне гэта, найперш, магчымасць удасканаліцца ў тым, што мне цікава. Хацелася паглядзець, як працуе Zeman у студыі, як будуе тэксты, чытае. Гэта тое, чаго я не ўмеў і пакуль што не зусім навучыўся. Часам мне пішуць, што «мой рэп — не зусім рэп». Хацелася папрацаваць са словам — не дзеля літаратуры, а зрабіць нешта для сябе.

Zeman: — Для мяне рэп — гэта трыбуна, з якой можна выказацца. Тут няшмат абмежаванняў і знойдзецца месца для любых пунктаў гледжання.

— Магчыма, з-за стэрэатыпаў пры згадванні рэпера ўяўляецца чалавек у шырокіх штанах, расцягнутай майцы і кепцы. Гэтая «мода» і сёння жывая?

Zeman: — Калі я казаў, што рэп — гэта трыбуна, я меў на ўвазе і тое, што рэп — гэта свабода. Сюды можа прыйсці чалавек любога выгляду, у любым адзенні, з любым колерам скуры і сказаць тое, што ён думае. Гэта галоўнае.

Angst: — Мой старэйшы брат з субкультуры «металістаў». І для яго рэперы ў шырокіх штанах заўсёды выглядалі проста камічна. Ён часта жартаваў, што ў гэтых калашынах можна мех бульбы насіць *(смяецца)*. Таму я вельмі рады, што з цягам часу і самі рэперы з гэтага выраслі, і мода вырасла разам з імі. Ёсць іншая складанасць: я дужа прызвычаіўся яшчэ ў юнацтве да камфортных шырокіх маек і баек, таму і сёння кашулі з грузікамі насіць вельмі складана, асабліва не люблю гальштукі.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Наколькі беларускі рэп арыентуецца на гурты з ЗША, дзе гэтая культура нарадзілася?

Zeman: — Канешне, уплыў ёсць. Для мяне арыенцірам служаць рэперы са Штатаў, Францыі, якія актыўна працавалі напрыканцы 1990-х. Я не скажу, што працую гэтаксама, як яны, але азіраюся на іх дасягненні. Сёння мэта многіх каманд — набраць больш праглядаў, больш «лайкаў». І ў такіх умовах зрабіць нешта сапраўды знакавае вельмі складана.

Angst: — Як чалавек, які заўжды знаходзіцца ў стане пошуку сябе, магу адзначыць, што на мяне ўплывае ўсё. Мне цікава, напрыклад, пераймаць тое, што робяць брытанцы, але Zeman сказаў: калі я буду рабіць так, як яны, ён мяне выганіць з гурта *(смяецца)*.

Zeman: — Не, я нікога выгнаць не магу, у нас усё вырашаецца на агульным галасаванні. Нас трое,таму два галасы — ужо перамога.

— У вас было супольнае выступленне — пад брэндам Belaroots. Падзяліцеся ўражаннямі...

Angst: — Я маю вялікі досвед выступленняў у іншай сферы і некалькі разоў сольна чытаў свой рэп. Апошняе не падабалася, нават думаў, што гэта не маё, бо няёмка пачуваюся на сцэне. Але менавіта выступленне з гуртом мяне вельмі натхніла. Сто разоў чуў, як артысты кажуць у інтэрв'ю «мы разгайдалі» залу, і ўпершыню менавіта з Belaroots я гэта адчуў.

Zeman: — Мне вельмі падабаецца, што я зноў маю шанц выступаць з камандай. У рэпе сябе заўжды лічыў гульцом камандным. Але так здарылася, што большасць тых, з кім працаваў раней, сышлі з рэпа

(праз узрост, змены ў светапоглядзе), і я застаўся адзін. А тут зноў з'явілася пачуццё каманды, пляча побач, калі можаш прапусціць радок, а хлопцы ў два галасы цябе падтрымаюць.

— Дарэчы, можа, ёсць нейкія сакрэты запамінання такіх вялікіх тэкстаў?

Zeman: — Шмат рэпеціраваць. Канешне, можна запомніць словы без рэпетыцый, але пры чытанні не будзе такой упэўненасці. Пасля рэпетыцый кожны ведае, дзе падхопліваць.

«Рэперы ў шырокіх штанах заўсёды выглядалі проста камічна. Мой брат часта жартаваў, што ў гэтых калашынах можна мех бульбы насіць».

Angst: — У мяне крыху іншая схема запамінання. Я магу на памяць каля трох гадзін чытаць чужыя вершы. Але адмыслова ніколі не вучыў, яны запамінаюцца, бо змяшчаюць нешта цікавае, маюць знаходкі на ўзроўні радка, страфы ці вобраза. Са сваімі тэкстамі і тэкстамі хлопцаў з гурта працую таксама. Запамінаю цікавыя радкі, а за іх чапляецца ўсё астатняе.

— Ці можна бліжэйшым часам пачуць і пабачыць Belaroots на сцэне?

Angst: — На пачатку вясны плануем зладзіць жывую прэзентацыю альбома «Аднакарэнныя» ў Мінску. Спадзяёмся, уваход будзе бясплатны. Думаем запрасіць як мага болей народу, каб проста пазнаёміцца. Гэта будзе натхняць на далейшую творчасць.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 15.02.2017 г.